# СУРАЎНЁВА АЛЕНА ПАЎЛАЎНА



**Месца нараджэння:** в. Папова, Шумілінскі раён

**Дата нараджэння:** 26.01.1926

**Дата смерці:** май 1944

**Месца подзвігу:** Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1942–1944

**Ушанаванне:** г. п. Обаль, Шумілінскі раён – вуліца, мемарыяльная дошка

Удзельніца камсамольскага падполля, разведчыца ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Летам 1942 года ўступіла ў Обальскае камсамольскае падполле. Са снежня 1942 года – разведчыца спецгрупы штаба Калінінскага фронту, якая дзейнічала ў Шумілінскім раёне. Збірала звесткі пра нямецкія воінскія часці. Вяла разведку на тэрыторыі Полацкага, Расонскага, былога Асвейскага раёнаў Віцебскай вобласці. Ноччу 24 мая 1944 г. года Алена выконвала чарговае заданне. Трапіла ў засаду ворага, была схоплена і забіта. А. П. Сураўнёва пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Пахавана на безыменнай вышыні ля в. Валясы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.

Імем А. П. Сураўнёвай названа вуліца ў г. п. Обаль Шумілінскага раёна. На будынку Обальскай сярэдняй школы, дзе яна вучылася, усталявана мемарыяльная дошка.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Захаранка, А.** У бой вялі непрымірымыя … / А. Захаранка // Маладосць. – 2004. – № 5. – С. 124–130.
2. **Рыц, Р.** Да апошняй хвіліны / Р. Рыц // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2007. – 22 чэрв. – С. 2.
3. **Рыц, Р.** Подзвіг разведчыцы / Р. Рыц // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2004. – 16 студз. – С. 2.
4. **Стамінок, Я.** Кветкі гераіні / Я. Стамінок // Віцебскі рабочы. – 1968. – 8 чэрв. – С. 3.
5. **Суравнёва** Елена Павловна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 582–583.
6. **Шаірка, С.** Подзвіг юнай патрыёткі / С. Шаірка // Чырвоная змена. – 1974. – 2 чэрв. – С. 3.

**Рыц, Р.** Да апошняй хвіліны / Р. Рыц // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2007. – 22 чэрв. – С. 2.

## ДА АПОШНЯЙ ХВІЛІНЫ

Лена Сураўнёва нарадзілася ў пасёлку Обаль Віцебскай вобласці. Вайну сустрэла 16-гадовай дзяўчынкай. Бачачы боль і пакуты свайго народа, зверствы гітлераўскіх захопнікаў, яна не змагла застацца ў баку ад барацьбы з імі. І стала ў рады народных мсціўцаў.

Самыя складаныя і небяспечныя разведвальныя заданні выконвала Лена ў тыле ворага. Партызанскую разведчыцу накіроўваюць на «Вялікую зямлю», дзе яна праходзіць спецыяльную падрыхтоўку. Хутка Лена зноў на Віцебшчыне ў саставе разведвальнай групы Івана Мікітавіча Пярова. Яна вяла разведку на тэрыторыі Полацкага, Расонскага, былога Асвейскага раёнаў.

Ваеннаму камандаванню тэрмінова спатрэбіліся звесткі аб нямецкім гарнізоне ў Себежы. Гэтае адказнае заданне даручылі Лене. Яна выбірала патаемныя лясныя сцежкі, пазбягала людных шляхоў і толькі перад горадам выходзіла на вялікую дарогу. Ва ўмоўленых месцах сустракаліся себежская настаўніца і беларуская партызанская разведчыца. Пасля кожнай такой сустрэчы па радыё перадавалася ваеннаму камандаванню каштоўная інфармацыя.

Але аднойчы Лена Сураўнёва на базу не вярнулася. Ноччу 21 мая 1944 года яна выконвала чарговае заданне. У гэты час ля вёскі Загноі немцы зрабілі засаду. Ісці ў абход было позна, і Лена вырашыла прарывацца. Яна пачала адстрэльвацца з пісталета. Аднак становішча аказалася безнадзейным. Здавацца ворагу жывой Лена не збіралася і стрэліла ў сябе. Няўдала...

Ворагі схапілі параненую дзяўчыну. Пачаўся допыт. Немцы білі яе, вырывалі валасы, выкручвалі рукі. Разведчыца маўчала. Фашысцкія каты выразалі на целе Лены зорку, затым нанеслі ёй 14 нажавых і штыкавых раненняў. Адважная патрыётка не сказала ні слова.

30 мая партызаны, якія адправіліся на пошукі Лены, знайшлі яе скатаванае цела недалёка ад вёскі. У кішэні ляжала запіска, адрасаваная баявой сяброўцы Любе Навасельцавай. Вось гэтыя хвалюючыя словы: «Люба, праз некалькі хвілін я памру. Але я не баюся смерці. Буду да апошняй хвіліны змагацца з ворагам. Дарагая Люба, я памру, але як мне хочацца жыць, мне ж усяго 18гадоў. Я не бачыла яшчэ жыцця. Але няхай ворагі ведаюць, што савецкая васемнаццацігадовая дзяўчына можа змагацца да апошняй хвіліны, не здаючыся. Перадай сябрам маім, што я не баюся смерці... Бывай!..».

Успамінаю, якое ўражанне зрабіў на мяне і вучняў паход на месца гібелі адважнай разведчыцы-партызанкі. Усе доўга маўчалі, ад хвалявання не змаглі сказаць ні слова.

Юная камсамолка-разведчыца Лена Сураўнёва пасмяротна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны другой ступені. Яна пахавана на безымяннай вышыні ля вёсцы Валясы. Вучні СШ № 1 г. Верхнядзвінска за кошт зробленых сродкаў паставілі помнік на яе магіле, адшукалі баявых сяброў Лены.

Многія гады захоўвалася школьная традыцыя: у маі на магіле Лены праводзілася ўрачыстая лінейка, прысвечаная памяці адважнай разведчыцы.

Першая сустрэча з баявымі сябрамі Лены адбылася ў 1974 годзе. Па запрашэнню юных следапытаў прыехалі: Іван Мікітавіч Пяроў з Масквы, Яўген Сцяпанавіч Бальшакоў з Кіева, Ванда Вальдэмараўна Мата з Рыгі, Тамара Васільеўна Залеская з Віцебска, наш зямляк Генадзь Дзмітрыевіч Савейка, бацькі Лены Павел Мікалаевіч і Ганна Пятроўна.

У цёплых задушэўных гутарках з вучнямі яны падзяліліся ўспамінамі аб Лене. У правядзенні ўрачыста-жалобнай лінейкі штогод прымалі ўдзел прадстаўнікі раённых кіруючых і грамадскіх арганізацый. Лепшыя вучні школы прымаліся ў піянеры і камсамол. Вельмі пажадана, каб важная школьная традыцыя аднавілася. Яна мае вялікі выхаваўча-патрыятычны змест – вучыць моладзь любіць сваю Радзіму, так, як любіла яе Лена Сураўнёва.

**Р. Рыц, былы дырэктар СШ № 1, краязнаўца**

**Суравнёва** Елена Павловна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 582–583.

**СУРАВНЁВА ЕЛЕНА ПАВЛОВНА**
**(26.1.1926 – май 1944)**

Участница комсомольского подполья, советская разведчица в годы Великой Отечественной войны.

Родилась в д. Попово Шумилинского р-на Витебской обл. Член ВЛКСМ. Окончила 8 классов Обольской средней школы. Летом 1942 вступила в Обольскую подпольную комсомольскую организацию; с декабря 1942 разведчица спецгруппы штаба Калининского фронта, действовавшей в Шумилинском р-не. Собирая сведения о вражеских воинских частях и их передвижении, разведчица в крестьянской одежде появлялась в самых опасных местах. С 1943 вела разведку в Верхнедвинском и Себежском р-нах. Ночью 24.5.1944, возвращаясь с очередного задания, попала в засаду врага. После ее гибели в донесении штабу фронта командир спецгруппы И. М. Перов писал: «Несмотря на чудовищные пытки, она не выдала врагу военной тайны, не назвала ни одного из разведчиков, ни одного из местных жителей, с которыми она держала связь. Подвиг Елены Суравнёвой заслуживает высокой правительственной награды». Похоронена на высоком кургане, на границе Верхнедвинского р-на Витебской обл. и Себежского р-на Псковской обл. Посмертно награждена орденом Отечественной войны II степени.

Именем Е. П. Суравнёвой названа улица в г. п. Оболь; на здании Обольской средней школы, в которой она училась, установлена мемориальная доска.